ПРОЛЕТАРЫІ УСЯХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 268 (340) | Нядзеля 24 лістапада 1940 г. | Цана 10 кап.

Спаборніцтва лесарубаў і вожыкаў

На заклік стаўбцоўскіх лесарубаў адказваем канкрэтнымі справамі

Мы, лесарубы першай брыгады Ашчэпскага лесаўчастка, горача падтрымліваем заклік стаханаўскай брыгады лесарубаў Стаўбцоўскага леспрамгаса аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва за датэрміновае выкананне плана лесазагатовак і лесавывазак. Мы ўзялі на сябе абавязацельства па прыкладу стаўбцоўскіх лесарубаў да дня выбараў у мясцовыя Саветы депутатаў працоўных—15 снежня—выканаць план лесазагатовак на 200 процантаў: замест плана 900 кубаметраў, загатовілі 800кубаметраў драўніны.

Узятыя абавязацельствы наша брыгада падмацоўвае канкрэтнымі справамі. Прымяняючы стаханаўскія метады працы, брыгада дабілася ўжо выдатных поспехаў і штодзённа выконвае норму па-загатоўцы драўніны на 150 процантаў.

Мы заклікаем усіх лесарубаў вобласці паследаваць нашаму прыкладу і шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва і стаханаўскі рух на лесазагатоўках і лесавывазках з тым, каб сустрэць знаменальны дзень 15 снежня поўным выкананнем плана загатоўкі і вывазкі леса.

Брыгада лесарубаў Ашчэпскага лесаўчастка:
Н. Грыцкевіч, Н. Шырынга, Н. Ганчаровіч, Н. Лысевіч, В. Грушэўскі, Н. Сінаўнік.
Ашчэпскі лесаўчастак, Поразаўскага раёна.

Тэхналагічная дысцыпліна і культура вытворчасці

У гістарычна невялікі тэрмін, літаральна за некалькі год, была перабаталявана на новай сучаснай тэхнічнай базе ўся наша сацыялістычная прамысловасць. „Гэта факт, што з пункту гледжання тэхнікі вытворчасці, з пункту гледжання аб'ёму насычанасці прамысловай вытворчасці новай тэхнікай, наша прамысловасць стаіць на першым месцы ў свеце" (Сталін). Цяпер, стала быць, сацыялістычная індустрыя ўзброена настолькі, што яна здольна вырашыць любую, нават самую складаную тэхнічную задачу.

Але для таго, каб скарыстаць магчымасць нашай тэхнікі, трэба ўзняць на вышэйшую ступень усю культуру вытворчасці. Прыём работы і арганізацыя вытворчасці, якія былі добрымі яшчэ ўчора, на саматужным прадпрыемстве, сёння становяцца тормазам нашага руху ўперад і затрымліваюць асваенне тэхнікі. Учора, на старых мартэнах, дзе варылася пластое, звычайнае жалеза, яшчэ як-небудзь, з грахом напалам, можна было работаць на-вока, па прывычцы, па інтуіцыі. Сёння, на сучасных мартэнах, дзе плавіцца высокаякасная сталь, нельга ўжо зрабіць і шагу без вымярэльнага прыбора, без дасканалай апаратуры, без хімічнага аналізу, без тэхнічнага кантроля. На старых маленькіх домнах, якія паўжартам называліся „самаварамі", быў у модзе майстар-кудзесник, які вызначаў ход доменнай печы на-слух, на-вока і амаль не пазнаўшы шлака. Сучасная металургія патрабуе навуковага вядзення кожнага агрэгата ў суадпаведнасці з дасканала распрацаваным і глыбока ўзважаным тэхналагічным працэсам. Грубую і нескладаную машыну можна было зрабіць без асаблівай дасканаласці. Сучасная-ж машына-будаўніцтва — вытворчасць аўтамабіляў, самалётаў, танкаў, узбраення, падшыпнікаў, электратэхнічнай, хімічнай і іншай апаратуры — немыслима без высокага класа дасканаласці. І новая тэхніка, якой мы распалагаем, і новыя патрабаванні, прад'яўляемыя да якасці выпускаемай прадукцыі, настойліва дыктуюць неабходнасць павышэння вытворчай культуры.

Цяпер ужо нельга варыць сталь, „якая выйдзе", а трэба варыць іменна такую сталь, як задана па заказу, бо калі для вытворчасці прасцейшай машыны можна было сяк-так прымяніць усякую сталь, то цяпер — для матора, для дызеля, для брані карабля, для падшыпніка, для адказнага станка — патрэбен метал толькі адпаведнай якасці, толькі з адпаведнымі, а не адвольнымі ўласцівасцямі. Для сучаснай машыны нельга выраблаць даталь „па памяці", па ўласнаму густу, а трэба строга захоўваць усе тэхнічныя правілы пры выкананні кожнай, нахай нават самай простай, вытворчай аперацыі. Малейшае парушэнне тэхналогіі, правіл вырабу прадукцыі прыводзіць да пагаршання яе якасці, а часам і да расстройства ўсяго вытворчага працэсу.

Да нядаўняга часу многія парушэнні тэхналагічнай дысцыпліны праходзілі незаўважанымі, так як кіраўнікі некаторых прадпрыемстваў ухіталіся за ўшчэрб дзяржаўным інтарэсам збываць і нагодную, бракованую, нестандартную прадукцыю. У пагоні-ж за колькасцю, часам пагаджалі якасцю, уводзілі ўсякага роду спрошчаную тэхналогію, абы як-небудзь аддзелацца ад заказчыка і хутчэй выпусціць прадукцыю. Указ ад 10 ліпеня 1940 года кладзе канец і гэтай з'яве. Больш таго. Указ адразу выкрыў слабыя месцы вытворчасці, і парушэнні тэхналогіі сталі ўсім кідацца ў вочы. Указ ад 10 ліпеня прадпалагае рашучую барацьбу з бракаробамі, сур'ёзнае паляпшэнне якасці прадукцыі, што ніяк немыслима без умацавання тэхнічнай дысцыпліны.

Днямі на металургічным заводзе імені Сталіна ў Данбасе адбылася агульна-заводская партыйна-тэхнічная канферэнцыя, прысвечаная пытанням тэхналогіі. Сталінскі завод дабіўся ў апошні час сур'ёзных поспехаў у сацыялістычным спаборніцтве металургаў і стаў адным з претэндэнтаў на атрыманне звання лепшага металургічнага завода краіны. Як указвалі таварышы на партыйна-тэхнічнай канферэнцыі, асновай апошніх поспехаў завода з'яўляецца павышэнне тэхналагічнай дысцыпліны. Доменны цэх завода выплаўляе чыгун класа „А". Яшчэ падаўна амаль 25 процантаў выплаўляемага чыгуна не адпавядала гэтаму класу. Чаму? Таму, што не было парадку на шыхтавым дворе, парушаліся правілы вядзення доменнай печы, мала фасфарытныя матэрыялы забруджваліся. Цяпер, калі наведзен парадак, калі правільна складаецца рэцэптура загрузкі доменнай печы сыравінай (шыхта), калі строга кантралюецца ход печы, — план выплаўкі чыгуна класа „А" стаў выконвацца. Мартэнаўцы гэтага завода строга захоўваючы правілы вытворчасці ў суадпаведнасці з устаноўленай тэхналогіяй, не толькі павялічылі выпуск сталі, але і дабіліся выпуску метала па заказах.

Партыйная арганізацыя сталінскага завода паступае зусім правільна, калі яна ўдзяляе павышаную ўвагу пытанням тэхналогіі. Клапоціцца аб умацаванні тэхналагічнай дысцыпліны абавязаны ўсе партарганізацыі, і не толькі первічныя, а таксама райкомы, гаркомы, абкомы, крайкомы, ЦК компартый саюзных рэспублік. Бо сапраўды бальшавіцкае кіраўніцтва прамысловасцю немыслима без барацьбы за высокую культуру вытворчасці, за дасканаласць у рабоце, за захаванне тэхналагічных рэжымаў.

Можна было-б прывесці нямала прыкладаў, у прыватнасці па перадавых прадпрыемствах Масквы і Ленінграда, калі поспех у вытворчасці і паляпшэнні якасці прадукцыі дасягнут дзякуючы ўмацаванню тэхналагічнай дысцыпліны. Але, нажаль, можна прывесці таксама вельмі многа фактаў, якія сведчаць аб прапагаючымся пагаршанні тэхналогіяй, аб саматужніцтве і вытворчай некультурнасці.

Узяць хаця-б у прыклад маскоўскі завод „Кампрэсар", дзе скрозь і радам дапускаюцца самавольныя адхіленні ад тэхналогіі. Гут усялякі можа камандаваць вытворчасцю па свайму разуменню. Скажам, донушкі парапрыёмніка машыны І-Э да прыварки павінны апрацоўвацца на станку. Майстар цэха тав. Аляксеў распарадзіўся: рабіць прыварку без апрацоўкі. Па правілах, адтуліну ў адным з кандэнсатараў трэба рассвідроўваць да дыяметра ў 28 міліметраў. Майстар прапануе: рассвідроўваць адтуліну да 32 міліметраў. Чаго можна чакаць ад такіх „парадкаў", апрача пагаршання якасці прадукцыі і зрыва вытворчасці? І, сапраўды, на „Кампрэсары" і план не выкананы, і браку многа.

Другі прыклад. На Неўскім заводзе ў Ленінградзе на рабочых месцах часта няма тэхналагічных карт. Рабочы атрымлівае толькі чарцёж і наряд, з якіх бачна, якую работу трэба выканаць. Але трэба-ж разам з тым даць рабочаму і тэхналагічную карту, паказваючую, як правесці работу, якімі інструментамі і прыстасаваннямі Гаворыць, што ў некаторых майстраў Неўскага завода добрая памяць і яны палагаюцца толькі на яе. „Памяць не падводзе". Але ва ўсякім выпадку, чаму-ж на заводзе велізарны брак, чаму агрэгаты, выпускаемыя заводам, маюць многа дэфектаў? Відавочна, па адной добрай памяці далёка не паедзеш. Патрэба культурная работа па пэўнаму тэхналагічнаму плану, прадуманаму, асмысленаму і зафіксаванаму.

Ужо пасля Указа ад 10 ліпеня 1940 года на Кальчугінскім заводзе імені Арджанікідзе Народны Камісарыят Дзяржаўнага Кантроля ўстанавіў факты грубейшага парушэння тэхналагічнай дысцыпліны. На гэтым заводзе быўшы начальнік цэха Логінаў па ўласнаму погляду змяніў рэжым работы пры траўцы ленты, а старшы майстар Шэмякін самавольна змяніў саставу шыхты для плаўкі спецыяльнай латуннай ленты. Не толькі рэзка павялічыўся брак на заводзе, але нагодная прадукцыя адгружалася і спажыўцам. Вінаўныя ў выпуску недобраякаснай прадукцыі прыцягнуты да судовай адказнасці. Вось да чаго можна дакаціцца знекажаючы дысцыпліну тэхналогіі.

Тэхналогія вытворчасці, натуральна, не можа быць і не сёе вечнай. Творчая думка савецкіх інжынераў, тэхнікаў, майстраў, стаханаўцаў б'е ў нас ключом і яна знаходзіць у тэхніцы ўсё новыя і новыя магчымасці і некарыстаныя рэзервы Не гледзячы на высокі ўзровень нашай тэхнікі трэба настойна рацыяналізаваць вытворчыя працэсы, умела ўкараняць тэхнічныя навінкі. Але часам пад сцягам „аператыўнасці" некаторыя рацыяналізатарскія прапановы ўкараняюцца ў вытворчасць без неабходнай праверкі, а папраўкі ў тэхналагічны працэс уносяцца амаль не кожны дзень. Такая рацыяналізацыя прыводзіць часам к адваротным результатам і выхоўвае зневажальныя адносіны да тэхналагічнай дысцыпліны. Калі створан новы, больш рацыянальны метад выканання той альбо іншай работы, ён павінен быць абавязковым за законам для ўсіх, таксама, як раней абавязковым быў стары метад. Самавольнічанне з тэхналогіяй павінна праследавацца, як нанясенне ўшчэрбу сацыялістычнай вытворчасці.

Захаванне тэхналагічнай дысцыпліны немыслима без планавай работы прадпрыемства. Там, дзе дапускаецца штурмаўшчына, дзе работа ідзе рывкамі, дзе простої змяняюцца спешкай і гонкай, там часцей усяго парушаецца тэхналогія і пагаршаецца якасць прадукцыі. Культурная планавая работа, строгая дысцыпліна, як працоўная, так і тэхналагічная дазволяць нашай прамысловасці завяваць новыя вышыні, паскараць яе рух на шляху тэхнічнага працэсу.

(Перадавы артыкул „Праўды" за 23 лістапада)

Кандыдаты ў дэпутаты пасялковых і сельскіх Саветаў

Дамачава. У гарадскім пасёлку адбыліся сходы працоўных па вылучэнню кандыдатаў у депутаты пасялковага Совета. Члены кравецкай і шавецкай арцелей на сваіх сходах вылучылі кандыдатамі ў депутаты пасялковага Совета чесных і адданых радзіме таварыстаў Халява І. Т. і Камянецкага Я. М. На сходзе выступіў выбаршчык Грышпан Берка у сваёй кароткай прамове ён сказаў:

— Пры польскай уладзе нам навязвалі кандыдатаў, прымушалі галасаваць за капіталістаў і памешчыкаў. Сталінская Канстытуцыя дае нам магчымасць выбраць тых, каго мы паважаем і лічым дастойнымі быць нашымі прадстаўнікамі ў органах совецкай улады.

З вялікім уздымам прайшоў прадвыбарчы сход у раённым Доме соцкультуры. На гэтым сходзе кандыдатамі ў депутаты пасялковага Совета вылучаны Лін Шля, які з малых год працаваў на капіталістаў, а зараз, пры совецкай уладзе, стаў дырэктарам млына; Спевак Цырля, якая раней была хатняй гаспадыняй, а зараз працуе касірам кінатэатра і прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце

Усе даверaныя асобы шырока разгарнулі сярод выбаршчыкаў агітацыю за вылучаных кандыдатаў у депутаты пасялковага Совета.

Г. Гутэрман.

* *
*

Камянец. У вёсцы Шчэрбава, Прускаўскага сельсовета, адбыўся сход сялян, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у депутаты сельскага Совета. Выбаршчыкі аднадушна пастанавілі вылучыць кандыдатамі сваіх лепшых адданых Ефім'ю Данісаўну Вайтовіч і Філіпа Філіпавіча Юськовіча. На гэтым-жа сходзе кандыдатам у депутаты сельскага Совета вылучан Аляксандр Васільевіч Крэштачук, які працуе зараз старшынёй Прускаўскага сельсовета.

Н. Сойка.

Даверaны за работай

На 215 выбарчым участку шырока разгарнулася агітацыя за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. К руе гэтай работай даверaны тав. Балакін.

Давер'е выбаршчыкаў тав. Балакін апраўдвае з чэсцю. Адразу пасля рэгістрацыі кандыдатам у депутаты абласнога Совета Васілія Іванавіча Чуйкова даверaны прыступіў да растлумачэння выбаршчыкам жыццёвага пуці вернага сына народа. У работу ўцягнут шырокі актыў агітатараў, чытчыкаў, бяседчыкаў, якія выкарыстоўваюць кожную вольную ад работы гадзіну для групавой і індывідуальнай агітацыі.

Балакін красамоўна расказвае, як Васілій Іванавіч Чуйкоў адданa змагаўся з ворагамі нашай радзімы ў годы грамадзянскай вайны, аб яго подзвігах пры вызваленні народаў Заходняй Беларусі з-пад ярма памешчыкаў і капіталістаў, аб яго барацьбе за абарону паўночна-заходніх граніц нашай радзімы і слаўнага горада Леніна. Кожная гутарка пабудавана так, каб выхоўваць у сваіх выбаршчыкаў пачуцці бязмежнай адданасці сацыялістычнай радзіме. І гутаркі даходзяць да масы.

Побач з гэтым агітатары пад кіраўніцтвам даверaнага дэталёва растлумачваюць выбаршчыкам Палажэнне аб выбарах у мясцовыя Саветы, правы і абавязкі грамадзян Совецкага Саюза. Падрэнна выкарыстоўваюцца для агітацыйнай работы насценныя друк, лозунгі і плакаты.

На ўчастку арганізаваны стол даведак, штодзённа даецца кансультацыя па пытаннях выбарчай кампаніі. Арганізавана дакладная праверка спісаў выбаршчыкаў.

Уся агітацыйная работа на ўчастку праходзіць арганізавана і падпарадкавана цэнтральнай задачы—палітычна падрыхтаваць выбаршчыкаў да гістарычнага дня 15 снежня, забяспечыць пагалоўны ўдзел усіх выбаршчыкаў у галасаванні, дружнае галасаванне за кандыдатаў непарушнага блока комуністаў і беспартыйных.

П. Тімачоў.

У дапамогу агітатарам

Кобрынская гарадская бібліятэка ў парадку падрыхтоўкі да выбараў у мясцовыя Саветы депутатаў працоўных арганізавала падбор выбарчай літаратуры для прапагандыстаў і агітатараў. У чытальні бібліятэкі адкрыта выстаўка літаратуры, прысвечаная выбарам. Літаратура падабрана на рускай, беларускай, яўрэйскай і польскай мовах. Тут ёсць Палажэнне аб выбарах, Канстытуцыя БССР, даклад таварыша Сталіна на VIII надзвычайным з'ездзе Саветаў аб праекце Канстытуцыі СССР, выступленне таварыша Сталіна на прадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Ст[illegible] скай выбарчай [illegible] літар[illegible] выбар[illegible] краін[illegible] літаратур[illegible] бы час могуць карыстацца наведвальнікі. У бібліятэцы зроблен[illegible] мантаж газетных выразак, прысвечаны выбарам.

Акрамя агітатараў чытальню бібліятэкі штодзённа наведвае бо-70 чалавек, карыстаецца літаратурай 130 чалавек. Агульны лік чытачоў бібліятэкі за час выбарчай кампаніі ўзрос да 1.800 чалавек. Працоўныя горада праяўляюць вялікую зацікаўленасць да чыткі літаратуры. Пры належных умовах лік наведвальнікаў бібліятэкі быў бы значна большым, але такія ўмовы не складзены. Памяшканне бібліятэкі знята пад кватэру. Чытальня змяшчаецца ў адным невялічкім пакоі, плошчай 20 квадратных метраў. А наведв[illegible] столькі, што [illegible]ыходзіцца мытаць стоячы. [illegible] м партыі і райвыканкам, не [illegible]ачы на неаднаразовыя патра[illegible] працоў[illegible], пакуль што [illegible] не зраоб[illegible] справе рас[illegible]нальні.

П. Бабобін.

Блытаніна ў спісах выбаршчыкаў

Безадказна аднеслася да складання спісаў выбаршчыкаў у Самацічскім горвыканкоме. Гэту важнейшую справу тут даручылі сакратару горвыканкома, а ён, не маючы дастатковага вопыту, дапусціў блытаніну і многа памылак.

Спісы выбаршчыкаў Дзяржынскага выбарчага ўчастка складзены нечысменна, пераблытаны прозвішчы і не пастаўлены чарговыя нумары выбаршчыкаў. Дапушчана многа пропускаў. Па вуліцы імені Карла Маркса былі прапушчаны выбаршчыкі двух дамоў.

Па Чырвонаармейскаму выбарчаму ўчастку № 2 у спісах, дзе траплялася некалькі аднолькавых прозвішчаў, замест прозвішчаў выбаршчыкаў пастаўлены рыскі Многія выбаршчыкі запісаны толькі па прозвішчу, без указання імя і імя па бацьку і года нараджэння. Выбаршчыца Сініца Анна запісана без указання імя па бацьку і года нараджэння. У спіс унесена непаўнагадовая Сініца Лідзія, якая нарадзілася ў 1925 г.

Горвыканком (старшыня Какора) не надае належнага значэння спісам выбаршчыкаў, не выпраўляе дапушчаных памылак.

А. Зорын.

ПА СОВЕЦКАЙ КРАІНЕ

На здымку: Гродненскі лесапільны завод № 7 (Беластоцкая абласць).
Фота А. Сапіра.
Фотахроніка Белта.

Высокія заработкі гарнякоў

Сотні гарнякоў Крывога Рога чыгуначнага басейна дасягнулі высокай вытворчасці працы і значна павысілі свае заработкі. Семіволас, які выканаў касгрычніцкае задание на 452,1 процанта, атрымаў 4.861 руб., члены яго брыгады Гудаў — 4698 рублёў, Гудаменка—4423 рублі. Звыш 3000 рублёў кожны заработалі бурыльшчыкі-семіволасаўцы Канюшын, Гуртавы і другія.

За калгасамі замацоўваюцца прамысловыя ўчасткі

За рыбалавецкімі калгасамі Карэла-Фінскай ССР замацоўваюцца навечна рыбныя і звераўбойныя ўчасткі. На кожны ўчастак саставляецца пашпарт, у якім указаны граніцы яго, пароды пражываючых тут рыб, марскога звера і г. д.

Фрэскі XII века

На днях ва Ўладзіміры, пры рэстаўрацыі Дзмітраўскага сабора, пабудаванага ў 1194—97 гадах, пад слоем штукатуркі, накладзенай у першай палавіне мінулага века, абнаружана мастацкая роспіс XVII—XVIII вякоў. Пад слямі масляной жывапісі аказаліся старадаўнія фрэскі, якія адносяцца да XII века. Яны адрозніваюцца здзіўляючым спалучэннем колераў.

На здымку: Будынак універсітэта ў г. Чэрнавіцы (Паўночная Буковіна)
Фота Козюка. Фота ТАСС.

Самаадданая работа эпронаўцаў

Шторм у Выбаргскім заліве засцігнуў вялікі караван суднаў, якія буксіраваліся эпронаўскім караблём. Караван кідала з стараны ў старану і панесла на камні. Неўзабаве пачалі лопацца тросы, якія злучалі судны. Людзям і суднам пагражала гібель. Дзякуючы самаадданай рабоце эпронаўцаў увесь караван суднаў быў сабран і шчасліва дастаўлен да месца назначэння.

Паведамленне ТАСС

Амерыканскае агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе, што, па сцвярджэнню германскай газеты „Гамбургер фрэмдэнблат", далучэнне Венгрыі да пакта трох дзяржаў дасягнута быццам „пры супрацоўніцтве і поўным адабрэнні Совецкага Саюза".

ТАСС упаўнаважан заявіць, што гэтае паведамленне ні ў якой меры не адпавядае сапраўднасці.

Рыхтуюцца да дня Сталінскай Канстытуцыі

Калгаснікі, рабочых і служачых Зеляновіцкага спіртзавода Гродзенскага раёна, актыўна рыхтуецца достойна сустрэць дзень Сталінскай Канстытуцыі—5 снежня. [illegible] узяў абавязацельства да дня [illegible] выканаць квартальны [illegible] выпуску прадукцыі на [illegible]таў.

А. Чураўскі

Узнагароджанне работнікаў канструктарскага бюро № 16

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 20 лістапада г.г. за паспяховае асваенне новых узораў узбраення 17 работнікаў канструктарскага бюро № 16 узнагароджаны ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза.

Ордэнам Леніна ўзнагароджаны: Бабурын Міхаіл Нікітавіч — вядучы канструктар і Таўбін Якаў Грыгор'евіч — начальнік канструктарскага бюро.

Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ўзнагароджан і чалавек, ордэнам „Красной звезды"— 8 чалавек, ордэнам „Знак почета" — 3 чалавекі і медалём „За трудовое отличие" — 8 чалавек.

(ТАСС).

Пасёлак [illegible] веку

КІЕЎ. (ТАСС). Вярнулася [illegible] педыцыя Цэнтральнага [illegible] нага [illegible] краіны. [illegible] дзіла [illegible] скае [illegible] При[illegible] лак брон[illegible] год Д[illegible] аста[illegible] ткі дамоў, менных глыб[illegible] выяўлены [illegible] захоўвання [illegible] булава [illegible] патрыярха ў [illegible] грамад[illegible]

У абкоме КП(б)Беларусі

18 лістапада абком КП(б)Б заслухаў даклады дырэктара Ружанскага і Высокаўскага райпромкамбінатаў т. т. Рабіновіча і Казакевіча аб рабоце мясцовых прадпрыемстваў. Абком КП(б)Б адзначыў, што Ружанскі райпромкамбінат прарабіў вялікую работу па аднаўленню і развіццю мясцовай прамысловасці. Камбінат арганізаваў і асвоіў слясарна-механічную, мяблёвую, бандарную і ганчарную вытворчасць. На прадпрыемствах уведзены нормы выпрацоўкі, якія большасць рабочых-стаханаўцаў перавыконваюць. Працоўная дысцыпліна ўмацавалася, прагулы і спазненні на работу ліквідаваны. У выніку гэтага гадавую праграму камбінат выканаў на 114 процантаў (замест 925,1 тысяч рублёў выпрацаваў таварнай прадукцыі на 1052,41 тысяч рублёў).

Разам з тым абком КП(б)Б устанавіў, што райпромкамбінат не скарыстаў усіх магчымасцей па расшырэнню існуючых і арганізацыі новых відаў вытворчасці. У некаторых цэхах яшчэ дрэнна наладжана арганізацыя працы. Масава-палітычная работа сярод рабочых і служачых праводзіцца нерэгулярна і на нізкім ідэйна-палітычным узроўні.

Недапушчальна дрэнна працуе Высокаўскі райпромкамбінат. Гадавую праграму выканаў толькі на 46 процантаў. З існуючых трох цагельных заводаў у гэтым сезоне два не працавалі. Асігнаваныя сродкі на арганізацыю новых відаў вытворчасці не асвоены.

Дырэктар райпромкамбіната тав. Казакевіч правяў бяздзейнасць у арганізацыі вытворчасці тавараў шырокага спажывання. Высокаўскі РК КП(б)Б і райвыканком дрэнна кіравалі райпромкамбінатам. Абком КП(б)Б прыняў па гэтаму пытанню разгорнутае рашэнне. Абком КП(б)Б абавязаў сакратароў райкомаў партыі, старшынь райвыканкомаў і дырэктараў райпромкамбінатаў пашырыць існуючую вытворчасць па выпуску тавараў шырокага спажывання (калёса-абоднае, бандарнае, ганчарнае). Арганізаваць у Ружанскім раёне вытворчасць сяней, дуг, карзіна-пляцення, выраб цацак і вытворчасць лыж. Арганізаваць у Высокаўскім раёне карзіна-пляценне, калёса-абодную і ганчарную вытворчасць. Адновіць існуючыя цагельныя заводы.

Абком КП(б)Б абавязаў райкомы КП(б)Б, райвыканкомы і абдмясцовым узмацніць кантроль і кіраўніцтва райпромкамбінатамі. Аказаць практычную дапамогу ў арганізацыі новых відаў вытворчасці, у развіцці сацыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху на прадпрыемствах, у наладжванні тэхналагічнага працэсу ў арганізацыі працы.

* *

Абком КП(б)Б заслухаў даклад начальніка аблза тав. Каралёва аб ходзе рамонту трактараў і сельскагаспадарчых машын у машына-трактарных станцыях. Абком КП(б)Б адзначыў, што ход рамонту трактараў і сельскагаспадарчых машын у МТС вобласці праходзіць яўна незадавальняюча. З агульнага плана рамонту трактараў на 15 лістапада адрамонтавана толькі 8,8 процанта.

Многія сакратары райкомаў КП(б)Б і старшыні райвыканкомаў рада раёнаў не ўдзяляюць увагі рамонту трактараў. Рад дырэктараў МТС правялі яўную бяздзейнасць, у рэзультаце чаго МТС аказаліся непадрыхтаванымі да рамонту трактараў. Некаторыя МТС зусім не прыступілі да рамонту (Маларыцкая, Кобрынская МТС і другія). Культурна-бытавыя ўмовы для трактарыстаў, якія працуць на рамонце, не створаны, няма інтэрнатаў, пасцельных прылад, не арганізавана харчаванне. Палітмасавая работа не наладжана. Сацыпаборніцтва ў радзе МТС сярод трактарыстаў не арганізавана. Арганізацыя працы на рамонце трактараў адсутнічае.

Абком КП(б)Б абавязаў сакратароў райкомаў КП(б)Б і старшынь райвыканкомаў устанавіць паўсядзённы кантроль за ходам рамонту і аказаць практычную дапамогу МТС па выкананню плана рамонту трактараў і сельгасмашын.

Абком КП(б)Б абавязаў дырэктараў МТС у трохдзённы тэрмін прыстасаваць адпаведныя памяшканні для рамонту трактараў; укамплектаваць рамонтныя брыгады; распрацаваць графік рамонту; стварыць для трактарыстаў культурна-бытавыя ўмовы і наладзіць палітмасавую работу; разгарнуць спаборніцтва паміж рабочымі за своечасовы і добраякасны рамонт. Начальніку аблза тав. Каралёву прапанавана [illegible] дзіць сістэматычны кантро[illegible] праверцы якасці рамонту [illegible] раў і выканання [illegible] МТС тэхнічну[illegible] памогу ў [illegible] раў і сельг[illegible]

Вера Данілаўна Матвеюк

...Дні цягнуліся як годы. Кожны з іх быў падобны адзін да другога. Раніцой і вечарам турэмная варта правярала ў камерах колькасць людзей і кожны раз над палітзняволенымі ўчыняла здзекі.

Маленькае накратаванае акенца, якое знаходзілася высока пад столлю, слаба прапускала праменні сонца. Толькі скрыгатанне ключа ў дзвярах камеры, ды лёгкі подых вецярка, які праз краты пракрадваўся з блізкага Мухаўца, нагадвалі жыхарам Брэсцкага мёртвага дома аб свабодзе.

Свабода!

Хто яшчэ больш мог так паніць гэта слова, як не яны — вязні польскіх панаў! Хто яшчэ так часта быў пазбаўлен свабоды, як не яны — прадстаўнікі працоўнага народа былой панскай Польшчы!

Сярод іх у Брэсцкай турме знаходзілася сялянская дачка з вёскі Лышчыцы Вера Данілаўна Матвеюк.

...Вераснёўскія дні 1939 года. Польскія паны і капіталісты ўцяклі з горада. Уцяклі таксама начальнікі і вартаўнікі турмы, заставіўшы палітзняволеных у закрытых камерах. Над горадам праходзіла хваля другой імперыялістычнай вайны.

Што рабіць?

Застацца ў закрытых камерах і чакаць смерці, ці ламаць дзверы і выйсці на свабоду?

Людзьмі аўладала рашучасць. Яны зламалі дзверы: ламалі рукамі, табуруткамі, цеглай — усім што попадалася пад рукі.

Свабода!

На турэмным двары сустрэлася двое людзей. Доўгія мінуты яны стаялі адзін супроць другога і не маглі вымавіць ні слова.

— Вера!

— Паўлоўскі!

Вера Матвеюк не ведала, што ў гэтай турме сядзеў яе муж. Яны пазнаёміліся ў час падпольнай работы ў 1931 годзе. І ўсяго за 8 год жылі разам толькі тры месяцы: іх раз'ядноўвала турма. Зараз пры нечаканай сустрэчы з мужам перад Верай паўстала ўсё яе жыццё, жыццё беднай сялянкі з палескай вёскі.

Гісторыя жыцця гэтай жанчыны звычайная. Нарадзілася яна ў 190[illegible] [illegible] вёсцы Лышчыцы, у [illegible] дзяў[illegible] па [illegible] і па[illegible] [illegible] ае [illegible] ць [illegible] ана [illegible] не мала.

Вера бачыла навал[illegible] мора чалавечай крыўды. Беззямельныя сяляне, батракі, жудасны напыя[illegible]нальны і эканамічны ўціск польскіх акупантаў. Над цёмнымі забітымі беларускімі вёскамі гулялі паліцэйскія гумовыя палкі. Яна не магла памірыцца з такім жыццём. У 1931 годзе маладая дзяўчына ўступае ў комсамол і вядзе рэвалюцыйную работу.

У 1932 годзе Вера Матвеюк прымае першае рэвалюцыйнае хрышчэнне ў брэсцкай дэфензіве. Двое сутак яе бязлітасна катавалі. Скавалі кайданамі рукі і ногі, білі гумовымі палкамі, лілі праз нос ваду, змешаную з газай. Ад маладой дзяўчыны польская дэфензіва патрабавала аднаго:

— Выдай сваіх таварышоў.

Гордае маўчанне Веры Матвеюк было адзіным адказам на жудасныя здзекі.

* *

17 верасня 1939 года. Гістарычная прамова таварыша Молатава па радыё. Часці доблеснай Чырвонай Арміі перайшлі граніцу былой польскай дзяржавы і прынеслі вызваленне сваім адзінакроўным братам беларусам і ўкраінцам.

— Гэтыя гістарычныя дні, — гаворыць тав. Матвеюк, незабываемыя на ўсё жыццё...

Вера актыўна ўключаецца ў будаўніцтва новага жыцця на вызваленай зямлі. Яна працуе членам сяляносага камітэта, затым старшынёй валаснога камітэта. Народ выбірае Веру Матвеюк дэпутатам Народнага Сабрання Заходняй Беларусі.

Сяляне Брэсцкага раёна добра ведаюць скромную жанчыну, загадчыка аддзела сацыяльнага забеспячэння Брэсцкага раённага выканаўчага камітэта Веру Данілаўну Матвеюк.

У райвыканком прыходзяць інваліды, хворыя, многадзетныя маці, з кожным пасобку цёпла гутарыць Вера Матвеюк. Яна добра ведае патрэбы насельніцтва і стараецца іх задаволіць. На гэтых людзей пры польскай уладзе ніхто не звяртаў увагі, ніхто ім не дапамагаў...

Сход сялян вёскі Вулька-Падгародская, Пугачэўскага сельсавета, вылучыў Веру Данілаўну Матвеюк кандыдатам у дэпутаты Брэсцкага раённага Савета дэпутатаў працоўных па выбарчай акрузе № 32.

— Будаваць сацыялізм, — сказала тав. Матвеюк на сходзе выбаршчыкаў, — гэта вялікае шчасце. Для мяне інтарэсы народа і дзяржавы вышэй за ўсё...

Верная дачка вызваленага народа, кандыдат сталінскага блока комуністаў і беспартыйных — Вера Данілаўна Матвеюк — з чэсцю апраўдае давер'е выбаршчыкаў.

І. Фальтэнберг.

Агітацыйна-масавая работа ў сельсавеце

У Крынніцкім сельсавеце, Шарашэўскага раёна, шырока разгорнута агітацыйна-масавая работа па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Арганізавана вывучэнне выбаршчыкамі Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выборах. Агітатары прымацаваны да дваццаці дворак, дзе яны праводзяць з насельніцтвам гутаркі. Асабліва добра працуюць агітатары Пракоп Кавлоўскі, Сяргей Мікулік, Ольга Клімец, Аляксандр Мікулік і Раман Рабчук.

Актыўна ўключылася ў прадвыбарчую работу хата-чытальня. Кожны вечар у хаце-чытальні бывае многа народу. Тут з насельніцтвам праводзяцца гутаркі на рознастайныя тэмы, агітатары расказваюць выбаршчыкам аб кандыдатах сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

В. Крываблоцкі.

Настаўніца Сладзінская Л. Д. зарэгістраравана кандыдатам у дэпутаты гарадскога Савета

Акруговая выбарчая камісія выбарчай акругі № 53 па выбарах у Брэсцкі гарадскі Савет дэпутатаў працоўных разгледзела паступіўшыя матэрыялы аб рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты гарадскога Савета. Устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў, акруговая камісія зарэгістравала кандыдатам у дэпутаты Брэсцкага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных па 53 выбарчай акрузе настаўніцу нарпоўнай сярэдняй школы № 8 гор. Брэста тав. Сладзінскую Лідзію Данілаўну, 1907 года нараджэння, беспартыйную, вылучаную кандыдатам агульным сходам настаўнікаў гор. Брэста, на якім прысутнічала 210 чалавек.

І. І. Мурэвіцкі

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Камандзір Краўчанка

Калі мы зайшлі ў канцылярыю роты, лейтэнант тав. Краўчанка, сядзячы за сталом гутарыў з камандзірамі ўзводаў. Ён расказаў аб заўвагах Наркома абароны Маршала Савецкага Саюза таварыша Цімашэнкі аб метадах абучэння байцоў і камандзіраў.

Падраздзяленне павінна канцентраваць свой агонь не ў секторы абстрэлу, які ім адводзіўся, як гэта было раней, гэта жорстка асуджае Нарком, — а канцентраваць агонь там, адкуль праціўнік пазвіцца. Свой расказ ён суправоджаў схематычнымі планамі начэрчанымі на паперы.

— Таварыш камандзір роты, ваш загад выкананы. Малодшы лейтэнант Ермакоў зараз прыедзе.

— Добра, — адказаў лейтэнант Краўчанка. Можаце быць свабодны.

— Есць, быць свабодным, — адказаў камандзір аддзялення і, чётка павярнуўшыся, вышаў.

Закончыўшы гутарку з камандзірамі ўзводаў, ён расказаў нам аб інспектарскай праверцы, якая нядаўна праходзіла.

— Калі я даведаўся, што наша вучэбная рота будзе правярацца па баявой і палітычнай падрыхтоўцы, я склікаў камандзіраў узводаў і камандзіраў аддзяленняў і расказаў ім меты праверкі і нашы задачы ў сувязі з гэтым. З іх дапамогай склаў падрабязны план заняткаў на кожны дзень праверкі. Я ўведамляў тую адказнасць, якая на мяне ложыцца за правядзенне праверкі, бо на праверку прыбыў прадстаўнік з наркамата абароны падпалкоўнік Капылоў.

У першы дзень праверкі была стральба. Я не сумняваўся ў добрых выніках. Так яно і атрымалася, па стральбе мы атрымалі адзнаку „добра", а аддзяленне тав. Галозы атрымала „выдатна". А помні ў самым пачатку арганізацыі школы малодшых камандзіраў тав. Галоза, Курач, Нагорны і другія стралялі вельмі дрэнна. Зараз непазнавальны.

Добрую адзнаку мы атрымалі таксама і па загароджанню. Выдатна выканаў заданне малодшы камавод тав. Курач.

Выдатнымі падрыўнікамі аказаліся малодшыя камандзіры т. т. Леонцьеў, Нагорны, Патаповіч. З 5 закладзеных зарадаў ні адзін не адказаў. Быў не выдатна праведзен падрыў. Агульная адзнака па падрыўной справе „добра". Падпалкоўніку тав. Капылову асабліва спадабалася фізічная і страявая падрыхтоўка. Падцягнутасць, акуратнасць, воінская выпраўка, ветлівасць — гэта неад'емныя якасці нашых малодшых камандзіраў. Хоць гэта і нялёгка давялося дасягнуць, — працягвае расказ тав. Краўчанка.

— Я не дапускаў фармальнасцей, умоўнасцей у вучобе. Канкрэтная задача і дасканалае яе выкананне без усякіх агаворак — вось вынік поспехаў. На ўсіх заняткох узводаў я прысутнічаў, і дзе бачыў, што праводзяцца дрэнна, паказваў як трэба праводзіць заняткі. Сістэматычна ўзнімаючы сваю падрыхтоўку, я адначасова вучыў камандзіраў і байцоў... Увесь час у сваёй рабоце я моцна апіраўся на комсамольскую арганізацыю, яна мне многа дапамагала ў выхаванні байцоў. Комсамолец Патаповіч быў неахайным, хадзіў без каўперыка, з неначышчанымі ботамі. Давялося з ім пагутарыць, а комсамольская арганізацыя мне дапамагла, ён стаў прыкметна мяняцца ў стораны лепшага. Зараз тав. Патаповіч лепшы малодшы камандзір: падцягнуты, акуратны, дысцыплінаваны. Ён з'яўляецца ў сучасны момант сакратаром комсамольскага прэзідыума роты.

Тав. Галоза зусім не мог страляць. Ён скардзіўся на вінтоўку. Прыйшлося а ім заняцца мне самому. Праверыў вінтоўку, праверыў яго веды. Галоза пасля гэтага стаў хутка спраўляцца і зараз ён выдатнік па стральбе. Выдатную ацэнку мае яго ўсё аддзяленне.

У словах лейтэнанта тав. Краўчанкі адчувалася радасць і гордасць за сваіх людзей, за сваю роту. Нядаўна на яго імя прыбыла тэлеграма ад генерал маёра таварыша Васільева, якая гласіць:

„Малодшаму лейтэнанту Краўчанку і асабоваму саставу вучэбнай роты аб'яўляю падзяку за добрую баявую падрыхтоўку.

Генерал-маёр Васільеў".

Малодшаму лейтэнанту т. Краўчанку зараз прысвоена званне лейтэнанта. Ён выдатны камандзір, скромны таварыш. У сваёй штодзённай дзейнасці змагаецца за выкананне высокіх патрабаванняў Наркома. Гэта выхаванец ленінскага комсамола, сістэматычна работае над узняццём свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню.

П. Буслоў.

Зах. АВА.

За доблесць і мужнасць праяўленыя ў баях ля возера Хасан, лейтэнант Б. З. Урацкі ўзнагароджан ордэнам Чырвонага Сцягу. Зараз падраздзяленне тав. Урацкага адно з перадавых у часці. Лейтэнант Б. З. Урацкі з баявым другам — канём „Мішкай", які раней належаў Герою Савецкага Саюза камісару Пажарскаму (1-я Асобая Чырвонасцяжная Армія).

Фота ТАСС.

ДА 120-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Ф. ЭНГЕЛЬСА

Старонкі гераічнага жыцця*)

(Па матэрыялах Інстытута Маркса—Энгельса—Леніна)

А. ЭРЛІХ.

1848 год. Еўропа ахоплена буравіем. Палымнеюць гаразды. Узброены народ выходзіць на вуліцу. Гэтыя дні натхнілі мноства мастакоў, павінуўшых патомству выдатныя творы.

Інстытут сабраў вялікую калекцыю гравюр таго часу: лютаўская рэвалюцыя ва Францыі — барыкады, сцягі, людзі ў лахманах, страляючыя з-за ўкрыцця, маладыя дзяўчаты з распушчанымі валасамі, натхнёна клікаючыя парыжан у бой; сакавіцкія падзеі ў Берліне — агонь і кроў на маставых, тут страляюць з усіх вакон; Вена — неба ахоплена зарывам пажару; венгерскае паўстанне — змрочны фон, які адцяняе суровую і грозную карціну шэсця рэвалюцыйнага народа, узброенага ружжамі, дручкамі, косамі, сакерамі...

У Кельне, галоўным горадзе прамысловай Рэйнскай вобласці, стала выходзіць пад кіраўніцтвам Маркса і Энгельса „Новая Рэйнская газета".

Вось перад намі першы нумар яе, датаваны 31 мая 1848 года.

Маркс быў з галавой занят агульным палітычным кіраўніцтвам і арганізацыйнымі клопатамі. Большую частку важнейшых палітычных артыкулаў у газеце піша Энгельс. Ён працуе настомна. „Ён сапраўдная энцыклапедыя, здольны працаваць у кожную гадзіну дня і ночы, пасля ежы, або не еўшы, хутка піша і кемлівы, як чорт", — піша аб сваім выдатным другу Карл Маркс.

Энгельс працуе настомна і горача, пяро яго пырскае ядам сарказма, ён кляймяць трусаў і здраднікаў, хлёстка здзекуецца над дробнабуржуазнымі балбатунамі, поўнымі хістанняў, робасці і нерашучасці. Ён абрушваецца на агульнагерманскае сабранне прадстаўнікоў, якое займаецца адной толькі балбатнёй, бясконцымі дэбатамі. „Франкфурцкая гаварыльня", „сабранне старых баб" — называе ён гэтую ўстанову.

„Гэта быў рэвалюцыйны час, у такі час працаваць у штодзённым друку — асалода, — пісаў пазней Энгельс. — Вачамі бачыш дзеянне кожнага слова: бачыш, як артыкулы літаральна б'юць быццам граната і як узрываецца выпушчаны снарад".

Магутны голас „Новай Рэйнскай газеты" падтрымлівае дух паўстаўшых у самыя цяжкія дні барацьбы. Здань комунізма бродзіць па Еўропе, наводзячы жах на правячыя класы.

Падзеі разрастаюцца. Фрыдрых Энгельс прымае непасрэдны ўдзел у рэвалюцыйных баях. Ён дзейнічае са зброяй у паўстанцкім корпусе, ён удзельнічае ў некалькіх бойках з урадавымі войскамі.

Многа нумараў „Новай Рэйнскай газеты" можа паказаць Інстытут — і сярод іх нумар, надрукаваны чырвонай фарбай, так званы „Чырвоны нумар", апошні нумар, датаваны 19 мая 1849 года.

Рэакцыя святкавала перамогу над рэвалюцыяй 1848—1849 гадоў, якая пранеслася над усімі буйнымі дзяржавамі Еўропы. Рэвалюцыйныя выбухі былі паўсюды падаўлены „у сілу недастатковай падрыхтаванасці пролетарыята і недастатковай развітасці капіталізма" (Ленін).

Маркс і Энгельс падводзяць вынікі барацьбы. У сакавіку 1850 года яны выпускаюць славуты „Зварот ЦК да „Саюза комуністаў". Паражэнне ёсць рэзультат здрадніцкай ролі, якую адыгралі дробныя буржуа і лібералы-дэмакраты. Мірныя і паступовыя рэформы — вось усё, аб чым марылі апартуністы.

Правадыры пролетарыята вучаць вопыт мінулых баёў: „Для вас справа ідзе [illegible] змяненні прыватнай улас[illegible] аб яе знішчэнні, не аб за[illegible]ванні класавых супярэчна[illegible] аб знішчэнні класаў, не аб [illegible]шанні існуючага грамадст[illegible] заснаванні новага грамад[illegible]

Рукапісны тэкст гэтага [illegible]рычнага звароту захоўва[illegible] Інстытуце сярод мноства іншых каштоўных рукапісаў Маркса і Энгельса.

Подвіг

Доўгі перыяд пасля рэвалюцыі 1848 года асноваполажнікі навуковага комунізма прысвяцілі капітальнаму завяршэнню сваіх тэарэтычных работ і збіранню пролетарскіх сіл для новых, рашаючых бітваў.

У гэтыя годы Энгельс бярэ на сябе цяжкі абавязак: каб даць магчымасць Маркву тварыць задуманы ім „Капітал", Энгельс сядзіцца за ненавісную камерцыйную канторку ў Манчэстэры: са скромнага свайго заработка ён на працягу двух дзесяцігоддзяў падтрымлівае сям'ю Маркса, толькі-б той не адцягваўся занадта ад сваёй тытанічнай працы.

Сярод твораў гэтай эпохі, маючыхся у распараджэнні Інстытута, часткова ў рукапісах, часткова ў першавыданнях, мы бачым працы Маркса — „Класавая барацьба ва Францыі з 1848 па 1850 г.", „Васемнаццатае брумера Луі Банапарта", працы Энгельса — „Сялянская вайна ў Германіі" і „Рэвалюцыя і контррэвалюцыя ў Германіі", якія падводзілі вынік толькі што адгрымеўшай барацьбе [illegible] а гэтая не [illegible] даю [illegible] вялікіх [illegible]

Энгельс невыпадкова зрабіў экскурс у далёкае мінулае, у часы сялянскай вайны. Вопыт паказаў, што пролетарыят павінен прыцягнуць на свой бок сялянскую масу. У саюзе з гэтай масай, ён безумоўна, разграміць сілы ворага.

У другім творы таго часу („Рэвалюцыя і контррэвалюцыя ў Германіі") Энгельс дае славутае, стаўшае класічным, вызначэнне ўзброенаму паўстанню.

Цікава адзначыць, што доўгі час аўтарам работы „Рэвалюцыя і контррэвалюцыя ў Германіі" лічыўся Маркс. Імена за яго подпісам яна была апублікавана ў адной амерыканскай газеце ў выглядзе рада артыкулаў. Аднак па перапісцы Маркса і Энгельса ІМЭЛ устанавіў, што „Рэвалюцыя і контррэвалюцыя ў Германіі" напісана ў асноўным Энгельсам. Гэтая „знаходка" лішні раз праліваае святло на выдатную дружбу двух вялікіх барацьбітоў, імёны якіх, як і іх думкі і справы, зліліся ў адзінае.

Энгельс — у Манчэстэры. Маркс — у Лондане. Амаль 40 год прыяцелі раздзелены друг ад друга. Але яны знаходзяцца ў пастаяннай, дасейнай перапісцы. Гіганцкая гэтая перапіска саставіла багацейшы ўклад у скарбніцу марксісцкай навукі.

[illegible] вельмі цяжкім. І тады Фрыдрых Энгельс бярэцца дапамагаць Марксу ў пісанні артыкулаў для „Нью-Йоркскай трыбуны" і для амерыканскай энцыклапедыі. Ён піша славутую серыю ваенных артыкулаў. Артыкулы былі ананімнымі. Вялікі вучоны паказаў у іх столькі глыбіні і ведаў, столькі майстэрскага аналізу падзей і з'яў, столькі стратэгічнага бляску, што ананімны аўтар прыцягнуў да сябе ўсеагульную ўвагу. З лёгкай рукі адной з дачок Маркса, за Энгельсам устанавілася з таго часу прозвішча „генерал". І сапраўды, ваенныя артыкулы Энгельса закладзілі аснову пролетарскай стратэгіі і тактыкі, усяму ваеннаму майстэрству пролетарскай рэвалюцыі.

Праходзяць яшчэ доўгія гады ўпартай працы. І вось, нарэшце, пісьмо Маркса ад 16 жніўня 1867 года, калі ён закончыў карэктуру „Капітала":

„Толькі табе абавязан я тым, што гэта стала магчымым. Без твайго самаахвяравання для мяне я ні зашто не мог-бы прарабіць усю велізарную работу для трох тамоў. Абдымаю цябе, поўны ўдзячнасці!..

Прывітанне, мой дарагі, верны друг!

Твой К. Марке".

Нельга без хвалявання [illegible] гледзець на гэтыя радкі. [illegible] многа [illegible] яны для [illegible] ра[illegible]бочага руху! Як [illegible] імкнаванняў падводзілі яны вы[illegible] Вялікі подвіг быў зроблен[illegible] Энгельс быў за ўсе гэтыя [illegible] гады верным памочнікам [illegible]генія рабочага класа.

*) Канец. Пачатак гл. у № 267 ад 23 лістапада.

Працяг на 3 стар.

СТАРШЫНЯ СЕЛЬСОВЕТА

Праскоўю Сямёнаўну Сідарук — старшыню Гарадзецкага сельсовета — мы засталі ў сваім кабінеце. Гэта-маленькі, але ўтульны пакой, дзе ўсё: і стол, і крэслы, і шафа, і паперы на стале — знаходзіцца на сваім месцы.

Старшыня сельсовета толькі што атрымала пратаколы агульных сходаў сялян, якія адбыліся ў сельсавеце па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты сельскага Совета. Зараз яна ўважліва іх праглядала, знаёмячыся з тым, каго сяляне вылучылі сваімі кандыдатамі ў дэпутаты.

— Бачыце! — звярнулася Праскоўя Сямёнаўна да нас, паказваючы на адзін з пратаколаў. У канцы гэтага пратакола, там дзе стаяць подпісы членаў прэзідыума, замест прозвішча быў пастаўлен крыжык. — Гэта следы польскай „цывілізацыі". Польскія паны трымалі працоўны народ у цемры і невуцтве. Гэта было ім выгадна...

Жанчына гаварыла і ў яе хуткіх вачах іскрылася злость, а ў мужным голасе гучала пракляцце польскім прыгнятальнікам, якія на працягу дваццаці год трымалі працоўны народ Заходняй Беларусі пад цяжкім уціскам капіталістычнай эксплаатацыі.

Нашу гутарку перапыніў нясмелы стук у дверы кабінета.

Зайдзіце! — адказала старшыня і кінула позірк на дверы.

У кабінет праз дверы прасунулася бабулька. Апіраючыся на кій, яна застанавілася ля дзвярэй.

— З чым добрым наведала нас, бабулька? — загаварыла Праскоўя Сямёнаўна.

— Я прышла наконт дроў...

Старшыня сельсовета ўважліва выслухала наведвальніцу, зрабіла якуюсь памятку сабе ў блакнот і паабяцала бабульцы, што, як прыедзе з раённага центра сакратар, ён упіша яе ў спіс на атрыманне дроў.

У сельсавет да Праскоўі Сямёнаўны штодзённа прыходзяць дзесяткі наведвальнікаў. Яны звяртаюцца да старшыні па рознастайных справах. Адны ідуць за парадай, іншыя за дапамогай. Праскоўя Сямёнаўна прыймае ўсіх ветліва, цярпліва выслухоўвае наведвальнікаў, дае парады, адказвае на запытанні.

Любоў і павагу да працоўнага народа гэта жанчына выхавала ў сябе з малых год. Яна з юнацтва прысвяціла сваё жыццё барацьбе за шчаслівую долю працоўных.

Праскоўя Сямёнаўна Сідарук нарадзілася ў глухой і бедной палескай вёсцы Ілаўск, у сям'і селяніна - серадняка.

Дачка беднага селяніна, не гледзячы на вялікае жаданне вучыцца абмежавала сваю адукацыю толькі двума класамі сельскай школы. Вучыць далей сваю дачку ў бацькі не хапіла сіл.

Жывучы ў глухой і забітай вёсцы, дзяўчына была сведкай беднага і жабрацкага жыцця палескіх сялян. На яе вачах сяляне стагналі пад гумавымі палкамі паліцэйскіх, пралівалі свой пот на шырокіх памешчыцкіх нівах і кулацкіх загонах. Дзяўчына бачыла, як над бяспраўным народам учынялася свавольствы і жудасныя здзекі.

Дваццаці-гадовай дзяўчынай Праскоўя Сямёнаўна Сідарук прымае актыўны ўдзел у рэвалюцыйнай дзейнасці падпольнай арганізацыі, у барацьбе сялян за сваё вызваленне.

Два гады падпольнай работы загартавалі маладую дзяўчыну, выхавалі мужны характар. Яе не спалохаў суд, які ўчыніла польская дэфензіва над групай рэвалюцыйных сялян у 1932 годзе. Праскоўя Сямёнаўна Сідарук трымала сябе на судзе стойка і не выдала застаўшыхся на свабодзе таварышоў па падпольнай рабоце. Яе асудзілі на два гады пазбаўлення волі.

Распачалося нудное турэмнае жыццё, поўнае знявагі і здзекаў над чалавечай годнасцю. Спачатку турма ў Кобрыне, потым у гарадах Седлец, Сандамір. Здавалася, што не будзе канца двухгадоваму заключэнню.

У 1934 годзе Сідарук выйшла з турмы. Катаванні і здзекі не зламалі яе волі да барацьбы. Яна зноў з галавой уходзіць у падпольную работу, аддаючы рэвалюцыйнай барацьбе ўсе свае сілы. Праз сем месяцаў пасля выхаду з турмы зноў арышт. Барацьбітоў за народную справу выдаў польскай дэфензіве вядомы правакатар Стральчук.

Суд адбываўся ў Кобрыне. Сідарук была асуджана на 6 год турэмнага зняволення. Яе на гэты раз сустрэлі сырыя і суровыя сцены цёмнай камеры цэнтральнай турмы для палітзняволеных жанчын у горадзе Фардоне.

Суровы турэмны рэжым, жудасныя здзекі і пабоі, якія чыніла над зняволенымі турэмная варта, падарвалі здароўе Праскоўі Сямёнаўны Сідарук. Яна захварэла на запаленне лёгкіх, пачалося моцнае крывацячэнне з горла. Так у хворым стане прабыла гэта жанчына шесць год у турме. Яе вызвалілі ў сярэдзіне 1939 года пасля сканчэння тэрміна заключэння...

З прыходам Чырвонай Арміі Праскоўя Сямёнаўна Сідарук уключаецца ў актыўную работу па ўстанаўленню рэвалюцыйнага парадку на вызваленай зямлі. Яна працуе ў сялянскім камітэце, потым пры часовым упраўленні ў горадзе Кобрыне, прымае ўдзел у стварэнні народнай міліцыі. Працоўныя выбіраюць сваю верную дачку дэпутатам Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. Праскоўя Сямёнаўна Сідарук з чэсцю выканала волю вызваленага народа — яна ад шчырага серца прагаласавала за совецкую ўладу.

Кіпучая, творчая работа на вызваленай зямлі захапляе гэту энергічную жанчыну. Сідарук працуе загадчыцай кобрынскага дзіцячага сада № 2, з'яўляецца членам акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР. У жніўні, пасля сканчэння абласных курсаў нізавых совецкіх работнікаў, яе прызначаюць старшынёй Гарадзецкага сельсовета, Антопальскага раёна.

Сельсавет быў адзін з адсталых у раёне. Новы старшыня энергічна ўзялася за работу. Яна распачала сваю дзейнасць з стварэння і згуртавання вакол сельсовета актыва. Зараз у сельсавеце налічваецца каля 60 актывістаў, якія з'яўляюцца першымі і надзейнымі дапаможнікамі ў рабоце старшыні.

Дзейнасць сельсовета тав. Сідарук падпарадкоўвае інтарэсам дзяржавы і народа. Аднойчы летам да старшыні прышоў актывіст з вёскі Мефодавічы Васіль Якімчук.

— Нашы сяляне жадаюць мець у сваёй вёсцы школу. Прышоў да вас за парадай...

Старшыня сельсовета падхапіла ініцыятыву сялян. Яна мабілізавала іх на будаўніцтва школы. І ў вёсцы да пачатку навучальнага года з'явілася новае прыгожае памяшканне сельскай школы — чатырохгодкі.

Праз тэрыторыю сельсовета праходзіць траса вялікага збудавання — Дняпра Бугскага канала. Сяляне, натхнёныя старшынёй сельсовета, прынялі самы актыўны ўдзел у будаўніцтве канала. Многія з іх працуюць на канале і зараз.

Праскоўя Сямёнаўна праводзіць вялікую работу па арганізацыі ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. На тэрыторыі сельсовета створана тры вячэрніх школы дарослых, у якіх насельніцтва ліквідуе спадчыну польскіх паноў — сваю непісьменнасць і малапісьменнасць.

Клопаты аб працоўным народзе і задавальненні яго патрэб, інтарэсы соцыялістычнай дзяржавы стаяць на першым плане ў старшыні сельсовета. У час германа-польскай вайны польскія афіцэры, адступаючы ў панічны, спалілі 42 дамы сялян вёскі Мефедавічы. Сельсавет правіў належныя клопаты аб пагарэльцах, аказаў ім матэрыяльную дапамогу і зараз усе яны заканчваюць адбудову новых дамоў.

Гарадзецкі сельсавет з адстаючых стаў перадавым. Сяляне паспяхова і ў тэрмін выконваюць свае абавязацельствы перад дзяржавай. У гэтым вялікая заслуга старшыні Праскоўі Сямёнаўны Сідарук.

Многа прарабіла старшыня сельсовета за гэты кароткі час у справе будаўніцтва новага жыцця на вызваленай зямлі. Але яна не супакойваецца на дасягнутым. У старшыні вялікія планы на будучае.

— Нам трэба мець добрую амбулаторыю, аптэку, кіно, — расказвае Праскоўя Сямёнаўна.

Сяляне паважаюць гэту звычайную, але з шчырым сэрцам жанчыну. Яны аказалі ёй вялікае давер'е: вылучылі кандыдатам у дэпутаты сельскага, раённага і абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

— Я ведаю, што значыць давер'е народа, — гаворыць старшыня сельсовета, — і пастараюся апраўдаць яго з чэсцю!

Ал. Махнач.

Антопальскі раён.

Экскурсанты аглядаюць скульптуру Ф. Э. Дзяржынскі" 10-гадовага мастака-самавучка, вучня сярэдняй школы г. Беластока А. М. Зеспіцкага, выстаўленую на Усебеларускай выстаўцы выдуманчага мастацтва „Лелія" і Стэлія арганізатарам БССР у г. Мінску.

Фота В. Хевіна.

Да 85-годдзя з дня смерці Адама Міцкевіча

У Кобрынскім раёне ідзе дзейная падрыхтоўка да 85-годдзя з дня смерці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча. Гарадская бібліятэка прыступіла да арганізацыі літаратурнай выстаўкі, прысвечанай памяці паэта. Першага снежня ў сярэдняй школе № 2 для шырокай грамадскасці раёна будзе зроблен даклад аб жыцці і дзейнасці паэта. Даклад будзе суправаджацца дэкламацыямі яго вершаў.

Вячэрняя школа дарослых

У вёсцы Грабары, Сямяніцкага раёна, адкрыта вячэрняя школа, у якой навучаецца 26 чалавек. Апрача агульнаадукацыйных дысцыплін, дарослыя вывучаюць Сталінскую Канстытуцыю і Палажэнне аб выбарах.

У вучобе асабліва добрых поспехаў дабіліся сяляне Яшчук Екацярына, Яшчук Іван і Шпанскі Нікалай.

Г. Кожыч.

Аднаўлен спіртазавод

Клышчэлі. Больш 20 год у Пакаеўскім сельскім совеце быў закінут спіртазавод. Надаўна гэты завод аднаўлен [illegible] і пу[illegible] тым [illegible] бочы[illegible]

Вечары мастацкай самадзейнасці для рабочых

Гайнаўка. Надаўна грудкаўскі лесапільны завод імені Чапаева наведалі артысты Маскоўскага тэатра лясной прамысловасці. Артысты прабылі на заводзе 9 дзён. За гэты час яны паказалі для рабочых 2 пастаноўкі — „Забаўны выпадак", „Чужы рабёнак" і далі некалькі канцертаў.

Артысты азнаёміліся з работай драматычнага гуртка завода і далі рад канкрэтных парад па далейшаму развіццю мастацкай самадзейнасці рабочых.

Кацура.

Слаўная дачка радзімы

Машына спынілася каля вялікага цаглянага будынка — галоўных вагонных майстэрняў. З цэхаў даносіўся гук матораў, лязг жалеза, удары кавальскага молата.

Стрэлка-гадзіннік набліжалася да 5 гадзін вечара. На дварэ пачынала цямнець. У невялікім пакоі канторы па набору і звальненню рабочай сілы нас сустрэў смуглы, невялікага росту юнак — сакратар комсамольскай арганізацыі майстэрняў тав. Пракапенка.

— Па якіх справах трапілі да нас? — запытаў ён.

— Нам патрэбна токар Оля Оўчарэк.

— Хутка скончыцца работа і я не вам паклічу. А пакуль што пабачце нашы падарункі для ўжо адкрываючыхся рамесленых вучылішчаў. Падрыхтавалі іх комсамольцы нашай арганізацыі.

Ён падняўся з-за стала і накіраваўся да шафы. Распахнуліся дверы і перад нашымі вачыма ляжалі металічныя, з любоўю зробленыя малаткі, зубілы, ліней[illegible]кі.

У вачах сакратара комсамольскай арганізацыі паказаліся іскаркі радасці. Ён з гордасцю сказаў:

— Комсамольцы гэтыя інструменты рабілі ў вольны ад работы час. Пэўная доля ў вырабе іх і токара комсамолкі Олі Оўчарэк. Яна ў нас выдатная работніца вытворчасці. Крыху памаўчаўшы, дадаў: — Наш калектыў аказаў ёй вялікае давер'е — вылучыў кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета.

Работа ў цэхах скончана. Рабочыя майстэрняў спяшаюцца дамоў. А вось ідзе насустрач і знатны токар — маладая, жыццярадасная дзяўчына — Оля Іосіфаўна Оўчарэк.

Пачалася гутарка. Перад намі паўсталі два рознастайных малюнкі ў жыцці гэтай юнай грамадзянкі: цяжкае абязздоленае жыццё пры ўладзе польскіх паноў, радаснае, поўнакроўнае жыццё пры новым шчаслівым совецкім ладзе.

* *

У гор. Брэсце ў сям'і чорнарабочага Іосіфа ў 1922 годзе нарадзілася дзіця. Маленькую дзяўчынку [illegible] Олай. Нарадасна [illegible] жыццё. Бацька з го[illegible] па найму ў багацеяў здабываючы [illegible] чорнага хлеба. [illegible] рукі — [illegible] якой [illegible] сілу. Заробку не хапала, каб пракарміць і апрануць сям'ю. Ежай часта служылі кавалак чорнага хлеба, ды посная пахлёбка. Рэдка калі сям'я бачыла мяса, шклянку малака. Гэта бывала толькі па святочных днях.

Яшчэ горш стала жыццё, калі памёр бацька. У сям'і давялося работаць усім. Маці работала на чыгунцы — чорнарабочай па ачыстцы пуці, сталі работаць і маленькія сёстры: Марыя і Оля.

Самай маленькай у сям'і была Оля, ёй, калі памёр бацька, было ўсяго 10 год. Прыходзілася рабіць дзве справы: днём наведваць школу, вечарам за адны харчы даглядаць дзяцей „ненавяльможнага" пана Баневіча — начальніка чыгуначнай пошты. У 1936 годзе пакінула школу. Аб вучобе і марыць не прыходзілася. У школе ў старэйшых класах мелі магчымасць вучыцца толькі дзеці багатых — паноў, заводчыкаў, кулакоў. Як прагна не імкнулася да вучобы Оля, больш 6 класаў скончыць не змагла. З 1937 па 1939 год Оля служыла ў маёнтку памешчыка Крэлавецкага. Гэты залатапагоннік, афіцэр ненавідзеў працоўных. Яшчэ больш ненавідзела іх яго жонка. Гэтыя паны напоўна адчувалі сваю пагібель. З ранку да позняй ночы Оля прымушана была працаваць на гэтых крывасмокаў. Спаць прыходзілася не больш 5 гадзін. Ад гаспадыні была заўсёды адна пахвала:

— Лодыры, вы сябе так на ежу не заработаеце...

Такім горкім, нарадасным праходзіла дзяцінства Олі Оўчарэк.

Толькі совецкая ўлада прадаставіла ёй пуцёўку ў сонечнае, квітнеючае жыццё, у жыццё без пакут і здзекаў.

Вось чаму яе радасці не было канца, калі ёй, у мінулым батрачцы, давялося пачуць вестку аб прыходзе вызваліцельніцы, роднай Чырвонай Арміі. Яна ведала, што цяпер для яе абавязкова ўхмыльнецца шчасце.

З першага дня совецкай улады Оля паступіла ўборшчыцай на ўпраўленне НКУС Брэсцкага чыгуначнага вузла. Тут яна прайшла значную школу выхавання, добра даведалася аб чэкістаў аб поспехах краіны соцыялізма, аб жыцці совецкага народа. У Олі склалася поўная думка пайсці работаць на вытворчасць. Яна хутка паступіла ў галоўныя вагонныя майстэрні ў якасці вучаніцы-токара. На першых парах старшыня рабочыя з маладога токара жартавалі:

— Гэта работа не для жанчын. Вудзеш токарам, толькі не па металу, а па хлебу.

— [illegible] па х[illegible] насці [illegible] адказ[illegible] яна.

Жарты былі [illegible] у былой панскай Польшчы жанчыну не падпускалі на гарышчы [illegible] да такой вытворчасці.

Калі праз два [illegible] Оля з вучаніцы стала токарам, жарты спынілі[illegible]. Рабочыя [illegible] што [illegible] яе былі [illegible] аргументам [illegible] не разыходзіцца [illegible] справа [illegible]

У м[illegible] яе з кожным днём ра[illegible]ла слава. Мінулыя жарты сціхлі, яны развеяліся, як дымавая заслона, пад напорам моцнага ветру. Для гэтага была істотная прычына. План яна выконвала не менш як на 120—160 процантаў.

20 студзеня ў жыцці Олі Оўчарэк была яшчэ адна радасная падзея: яе прынялі ў рады комсамола. На бюро ГК ЛКСМБ Оля з гордасцю заявіла:

— Зраблю [illegible] з гонарам насіць назву [illegible] ганаровую — члена Лені[illegible] Сталінскага комсамола.

Гэта яе абавязвала працаваць яшчэ лепш і адданей [illegible] сваёй новай со[illegible] дзімы.

Назву члена Ленінска—Сталінскага комсамола [illegible] яна з гонарам апраўдвае. На вытворчасці Оля лепшая стахановка, у асобныя дні план выконвае [illegible] 250 [illegible] процантаў.

Любяць і [illegible] у рабочым калектыве [illegible] Оля [illegible] не прыкладу, на вытворчасць [illegible] галоўных вагонных майстэрняў прыйшло работаць больш 40 жанчын.

Вось чаму на прадвыбарчым сходзе ў майстэрнях яе аднадушна вылучылі кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета па 152 выбарчай акрузе. Майстар механічнага цэха тав. Патанін на многалюдным сходзе заявіў:

— Оля Оўчарэк — узор дысцыпліны і стахановскай працы. Яна адна з дастойных работніц на вытворчасці. У мінулыя выбары ў Вярхоўныя Саветы СССР і БССР работала членам акруговай камісіі. Зараз з'яўляецца старшынёй выбарчай акругі. Яна заслужала, каб яе вылучыць кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета.

У гэтых простых словах выказана ўся праўда аб выдатным чалавеку, слаўнай дачцы соцыялістычнай радзімы. Тав. Оўчарэк за выдатную работу на вытворчасці мае некалькі заахвочванняў, прэміраванне, яна дастойны кандыдат працоўнага народа.

Т. Паўлаў.

Цяпер канчаўся „егіпецкі палон" для Энгельса. Толькі цяпер ён піша Марксу, з якой радасцю ён нарэшце з „сабачай камерцыяй".

Элеанора, малодшая дачка Маркса, гаспадарала ў Энгельса ў тыя самыя дні, калі ён скідваў з сябе 20-гадовыя аковы, і вось што яна піша ў сваіх успамінах:

„Я ніколі не забуду таго, як ён з урачыстасцю ўсклікнуў: „у апошні раз!", адзяваючы раніцой свае боты, каб — у апошні раз адправіцца ў кантору. Некалькі гадзін пазней, калі мы, чакаючы яго, стаялі ля варот, то ўбачылі яго ідучым па маленькаму полю супроць дома. Ён размахваў у паветры сваёй палкай і спяваў і смяяўся ва ўсю. Потым мы піравалі па-святочнаму, піл шампанскае і былі шчаслівыя. Тады я была вельмі маладая, каб разумець, цяпер-жа я ўспамінаю аб гэтым са слязьмі."

Правадыр і настаўнік рабочага класа

Цяжка нават пералічыць усё багацце матэрыялаў, якія ёсць у Інстытуце і ў якіх адлюстравана гісторыя сусветнага рабочага руху.

[illegible] старонкі Устаноўчага маніфеста [illegible] Інтэрнацыянала, старонкі Статута, [illegible] членскага [illegible] Інтэрнацыя[illegible] [illegible]адніс[illegible] са, табліцы, [illegible] снаручна ад[illegible] [illegible] саджэнняў [illegible] [illegible]рнацыяг[illegible] [illegible]лікіх [illegible]

Марксі Энгельс былі душой „Саюза комуністаў", арганізатарамі і кіраўнікамі „Міжнароднага Таварыства Рабочых" — першага Інтэрнацыянала. Колькі баёў за прынцыпы пролетарскага інтэрнацыянала вытрымалі Маркс і Энгельс у барацьбе з усякага роду апартуністамі, з анархістамі і іншымі ворагамі рабочага класа! Дзейнасць Маркса і Энгельса — узор прынцыповасці і непрымірымасці у барацьбе за справу міжнароднага пролетарыята. З якім захапленнем сачылі Маркс і Энгельс за гераічнай барацьбой парыжскіх комунараў! Намала парад і ўказанняў атрымоўвалі ад Маркса і Энгельса дзеячы Парыжскай Комуны, гэтай першай у гісторыі чалавецтва дыктатуры пролетарыята.

...Вось нумары газеты „Форверто", у якіх друкаваўся Энгельсаўскі „Анты-Дзюрынг", рукапіс Энгельса „Дыялектыка прыроды", рукапіс „Развіццё соцыялізма ад утопіі да навукі", адыграўшая такую велізарную ролю ў папулярызацыі марксізма...

Тут карціны і гравюры, якія адносяцца да гісторыі Парыжскай Комуны, пратаколы кангрэсаў Інтэрнацыянала, першыя рэцэнзіі на "Капітал", тэкст першай адозвы Генеральнага совета Інтэрнацыянала з папраўкамі Маркса, [illegible] матэрыялы, якія адпо[illegible] [illegible]арацьбы за стварэнне [illegible] [illegible]сала, Прудона, [illegible] рукапісы і ма[illegible] [illegible] тымі дзямі, [illegible] [illegible]акт уступі[illegible]

Тут славутая „Крытыка Гоцкай праграмы", у якой Маркс піша:

„Паміж капіталістычным і комуністычным грамадствам ляжыць перыяд рэвалюцыйнага ператварэння першага ў другое. Яму адпавядае і палітычны пераходны перыяд, і дзяржава гэтага перыяда не можа быць нічым іншым, акрамя як рэвалюцыйнай дыктатурай пролетарыята".

Ёсць тут і жалобная тэлеграма ад 14 сакавіка 1883 года — Энгельс тэлеграфіруе Зорге: „Марксі скончаўся сёння".

З гэтага часу Энгельс бярэцца за стварэнне новых вялікіх подзвігаў, якія не маглі быць па-плачу нікому іншаму: ён працуе над завяршэннем II і III тамоў „Капітала" Маркса. Яму было ў той час ужо 63 годы. Ці пражыве ён дастаткова часу, каб завяршыць гіганцкую працу? Ён піша Лаўрову: „Асабліва гэта непакоіць мяне таму, што я — адзіны з застаўшыхся ў жывых, хто можа расшыфроўваць гэты почырк і гэтыя скарачэнні асобных слоў і цэлых фраз".

Энгельс пражыў пасля смерці свайго друга яшчэ 12 год і ўсе гэтыя годы з велізарным напружаннем сіл працаваў, выконваючы завяшчанне Маркса: ён зраб[illegible] тое, чаго ніхто іншы не ў сілах быў бы выканаць: расшыфраваў і дапрацаваў II і [illegible] томы „Капітала", падрыхтаваў англійскі пераклад гэтай грам[illegible]ёзнай навуковай працы, падрыхтаваў новыя выданні і пераклады на розныя мовы „Нішчаты філасофіі", „Восемнаццатага брумера", „Класавай барацьбы [illegible] Францыі" і інш. Ён напісаў за гэтыя годы буйнейшыя работы — „Людвіг Фейербах", „Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы". Гэтую работу ён лічыў завешчанай яму другам: Маркс даўно задумаў такую працу і ўжо сабраў для яе матэрыялы, якімі Энгельс карыстаўся.

Стары чалавек, які да канца дзён сваіх захаваў незвычайную жывасць, энергію і вострыню мыслі, Энгельс многа яшчэ зрабіў для арганізацыі масавага рабочага руху.

„Пасля смерці Маркса,— пісаў Ленін, — Энгельс адзін прадаўжаў быць дарадцай і кіраўніком еўрапейскіх соцыялістаў. — Да яго аднолькава зварачаліся за парадамі і ўказаннямі і нямецкія соцыялісты, сіла якіх, не гледзячы на ўрадавыя праследаванні, хутка і непрарыўна павялічвалася, і прадстаўнікі адсталых краін, — напр., іспанцы, румыны, рускія, якім прыходілася абдумваць і ўзважваць свае першыя крокі. Усе яны чэрпалі з багатай скарбніцы ведаў і вопыту старога Энгельса" (Ленін, том I, стар. 415).

Са стварэннем II Інтэрнацыянала дзейнасць Энгельса ва многа раз узмацнілася. Але з ростам рабочага руху ня спынна ўзмацнялася і дзейнасць дробнабуржуазных дэмаралізатараў, усякага роду апартуністаў і рэфармістаў. З неастываючай страсцю абрушваўся на іх Энгельс, абараняючы галоўнае ў вучэнні марксізма — ідэю дыктатуры пролетарыята.

Устанаўленне штогоднага першамайскага пролетарскага міжнароднага свята выклікала захапленне ў сэрцы старога Энгельса і мая 1890 года Энгельс пісаў:

„... Сёння, калі я пішу гэтыя радкі, еўрапейскі і амерыканскі пролетарыят праводзіць агляд сваім баявым сілам, упершыню мабілізаваным у адну армію, пад адным сцягам... і відовішча сёнешняга дня пакажа капіталістам і землеўласнікам усіх краін, што пролетарыі ўсіх краін сёння сапраўды з'ядналіся. О, калі-б Марксі быў цяпер побач са мной, каб бачыць гэта ўласнымі вачыма!"

* *

Энгельс памёр 75-ці год, у 1895 годзе. Па волі памёршага, урна з прахам яго была пахавана ў хвалях Ла-Манша, ля скалістых берагоў Істбэрна.

У Інстытуце ёсць фатаграфія Істбэрна. На паўднёвым беразе Англіі, дзе так любіў адпачываць вялікі вучоны і барацьбіт і дзе пажадаў ён быць назаўсёды пахаваным, высока над морам узнімаецца крутая скала; б'ецца, пенячыся, цяжкія хвалі.

Будзе час, калі бераг ля Істбэрна — пустынная скала над бушуючым морам — упрыгожыцца сведчаннем любві і ўдзячнасці вызваленага чалавецтва сваяму вялікаму настаўніку.

Комуністы аднаго падраздзялення

Стрэльбішча здавалася пустынным. Але вось пачулася каманда і гулкі стрэл парушыў цішыню хмурнага восеньскага дня.

Малодшы камандзір Саак'ян уважліва паглядзеў туды, дзе быў распаложан „праціўнік". Міна лягла крыху лявей.

— Правей 0-05. Агонь! Ска-мандаваў ён.

Чырвонаармеец Кузмянкоў хутка зрабіў папраўку. На гэты раз разам з грудамі зямлі ад разрыва міны ў павітра ўзляцелі трохі трох мішеней. „Праціўнік" быў знішчан.

Услед за Кузмянковым стралаў Якшлекоў. Стралаў няменш паспяхова. І калі прагрымеў апошні стрэл, камандзір падраздзялення абвясціў:

— Малайцы! Лічу аддзяленне падрыхтаваным выдатна.

Гэта была заслужаная і дастойная ацэнка работы аддзялёнага камандзіра-комуніста Саак'яна.

Іх, смуглаліцых комуністаў, у падраздзяленні трое — здаровых хлапцоў, прыехаўшых з пачатку гэтага года ў часць з квітнеючай Арменіі. Яны прыехалі з аднаго раёна і адначасова. Ніхто з іх не ведаў рускай мовы.

— Гэта дрэнна, чытаць трэба оказаў Моўсесян.

І сябры засялі за кнігі. Вучыліся настойліва, многа. Ды інакш і нельга! Яны-ж комуністы, павінны быць упераадзе, наведанне рускай мовы — сур'ёзная перашкода на шляху да мэты.

Яны не лічыліся з часам, з зморанасцю. Звярнуўшыся з працяжнага тактычнага вучэння садзіліся за вывучэнне рускай мовы. І авалодалі ёй хутка.

Настойлівасць — добрая якасць воіна Чырвонай Арміі, і дзякуючы гэтай якасці комуністы Моўсесян, Саак'ян і Захаран паспяхова скончылі школу, выйшлі адтуль пісьменнымі, зелавымі малодшымі камандзірамі.

Асабістым прыкладам уцягваюць байцоў комуністы за ўпартую вучобу. Калі на тактычных занятках чырвонармеец Грышын, баючыся замазацца ў гразь, стаў направільна перапаўзаць, яго [illegible] аддзялення Захаран.

— Глядзіце, як трэба перапаўзаць.

Ён хутка ўпаў на зямлю і не гледзячы па гразь (у бою інакш і нельга) паказаў, як трэба перамагчы небяспечную зону.

У асабістай справе кожнага з комуністаў — па некалькі падзяк. Аддзяленне Саак'яна і Захарана — перадавы ў падраздзяленні. Напярэдадні свята 23 гадавіны Кастрычніка тры чырвонаармейцы з аддзялення Саак'яна атрымалі падзяку. Падзяку мае амаль кожны чырвонаармеец аддзялення Захарана.

Аддзялённы камандзір Моўсесян работае памочнікам камандзіра ўзвода.

— Мой памочнік — гаворыць малодшы лейтэнант Арцёмаў — прыкладны ва ўсім.

Ён увор для байцоў. Кожныя заняткі ён праводзіць так, як гэта патрабуюць умовы сучаснага бою.

Разам з камандзірам узвода, Моўсесян змагаецца за рацыянальнае выкарыстанне кожнай мінуты вучобнага часу.

Нядаўна ўзвод выходзіў на стрэльбішча. Да яго пяць кілометраў. Каб не траціць каштоўнага часу, узвод па шляху на стрэльбішча адрабатваў дзеянне на маршы — расчляненне пры налётах ав'яцыі, нападзенні танкаў і г. д.

Комуністы — барацьбіты за ўзмацненне совецкай воінскай дысцыпліны. Узвод, дзе памочнікам камандзіра Моўсесян — найбольш дысцыплініраваны ў падраздзяленні, за апошніх чатыры месяцы тут не зроблена ні аднаго дысцыплінарнага праступка. Такое-ж становішча і ў аддзяленні Саак'яна і Захарана.

Па вечарах комуністы — у кругу байцоў. Большэвіцкія агітатары горача расказваюць аб перамогах краіны Совецтаў, аб патрабаваннях, прад'яўляемых навукам абароны да байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі. Буднічная работа, але колькі карыснага нясе яна баявому згуртаванню падраздзялення!

С. Алёшын.

Зах. АВА

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 22 лістапада. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне паведамляе: „У ноч на 21 лістапада германская авіяцыя зрабіла паспяховыя налёты на Лондан, Бірмінгам, ваенныя прадпрыемствы Цэнтральнай Англіі, партовыя збудаванні і прадпрыемствы забсопячэння ў Паўднёвай Англіі. У радзе месц узніклі шматлікія пажары.

Учора былі скінуты бомбы на Лондан і важныя ў ваенных адносінах аб'екты ў Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Англіі.

Англійскія самалёты ў ноч на 22 лістапада на тэрыторыю Германіі не залятаді. Два германскіх самалёты загінулі без вестак.

Бамбардыроўка югаслаўскай тэрыторыі

БІТОЛЬ, 22 лістапада (ТАСС). 21 лістапада ў 12 гадзін 35 мінут чатыры бамбардыроўшчыкі невядомай нацыянальнай прыналежнасці зноў парушылі югаслаўскую граніцу на поўнач ад сяла Стэнье. Яны накіраваліся да гары Перыстэры і далей да горада Бітоля. У 12 гадзін 40 мінут у Бітоле была аб'яўлена паветраная трывога. Югаслаўскія знішчальнікі падняліся насустрач замежным бамбардыроўшчыкам. Апошнія адразу-ж павярнулі назад, папярэдне скінуўшы 6 бомб, якія ўпалі паблізу сяла Брусчік (у 6—7 кілометрах ад горада Бітоля).

Гэта чацверты выпадак бамбардыроўкі югаслаўскай тэрыторыі ў лістападзе і 18 выпадак парушэння граніцы Югаславіі замежнымі самалётамі.

5 лістапада быў бамбардыраван Бітоль, 16 лістапада было скінута некалькі бомб непадалёку ад чыгуначнай станцыі Бітоль, паблізу ад зенітнай батарэі, 17 лістапада былі скінуты бомбы ля горада Кічэво, 19 лістапада былі скінуты тры бомбы каля пагранічнай варты ля сяла Стэнье і 21 лістапада скінута 6 бомб паблізу сяла Брусчік.

Амерыканскі друк аб рашэнні палаты прадстаўнікоў ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 22 лістапада. (ТАСС) Каментыруючы адхіленне палатай прадстаўнікоў прапановы аб адтэрміноўцы сесіі амерыканскага кангрэса, вашынгтонскі карэспандэнт газеты „Нью-Йорк таймс" адзначае, што гэта першае паражэнне прыхільнікаў Рузвельта ў кангрэсе пасля скончэння прэзідэнцкіх выбараў. Супроць прапановы аб адтэрміноўцы сесіі кангрэса акрамя рэспубліканцаў галасавала 44 дэмакраты, 2 прагрэсісты і адзін член рабочай партыі. За гэту прапанову галасавала 148 дэмакратаў.

Паражэнне лідэраў палаты прадстаўнікоў у гэтым [illegible] ні, як відаць, тлумачыцца некалькімі прычынамі. Выключнае адзінадушша, з якім галасавалі рэспубліканцы—члены палаты прадстаўнікоў сведчыць аб тым, што асноўнай прычынай з'яўляецца адазіцыя рэспубліканцаў супроць Рузвельта. Адразу-ж пасля выбараў многія рэспубліканскія дзеячы зак[illegible] жэнпартыйнага [illegible] ўлення і [illegible] рэспубліканскую партыю працягваць заставацца ў апазіцыі. У палаце прадстаўнікоў рэспубліканцы, як відаць, рашылі прытрымлівацца намечанай Уілкі праграмы.

Члены кангрэса, якія выступалі супроць якога-небудзь удзелу ў вайне, як, напрыклад, член рабочай партыі Марантоніо і многія ізаляцыяністы — дэмакраты і рэспубліканцы з сярэднезаходніх штатаў, таксама выступаюць супроць адтэрміноўкі сесіі кангрэса.

Адначасова члены кангрэса, адлюстроўваючыя погляды буйных прамыслоўцаў і фінансістаў, таксама выступаюць супроць адтэрміноўкі сесіі кангрэса, патрабуючы, каб кангрэс неадкладна-ж пераглядзеў рад законаў, кранаючыхся зарплаты, працягласці рабочага дня і г. д. Яны асабліва настойваюць на тым, каб кангрэс адобрыў законапраект, які знаходзіцца на разглядзанні, накіраваны да таго, каб аслабіць рабочае законадаўства, прадстаўляючае права заключаць калектыўныя дагаворы і другія правы.

Як перадае карэспандэнт газеты Нью Йорк пост" з Вашынгтона, палата, асацыяцыя прамыслоўцаў і другія ўплывовыя арганізацыі энергічна дабіваюцца, каб кангрэс адобрыў такія мерапрыемствы, якія анулівалі б розныя рэформы, праведзеныя некалькі год таму назад. Газеты „Нью-Йорк таймс" і другія буйнейшыя газеты таксама выступаюць супроць адтэрміноўкі сесіі кангрэса.

Ваенныя дзеянні ў Грэцыі

БІТОЛЬ, 22 лістапада. (ТАСС) Усю ноч і раніцу ў ваколіцах горада Бітоля была чутна моцная артылерыйская кананада, якая даносілася з італа-грэчаскага фронта каля Корчы. Відаводна, грэчаскае камандаванне рашыла флангавым ударам адкінуць італьянцаў ад Корчы. Перадавыя грэчаскія атрады сёння раніцай уступілі ў Корчу. Італьянскія войскі працягваюць адыходзіць на поўнач у с[illegible] рану Эльбасана. З Охрыда пав[illegible] ламляюць, што ў раён возера О[illegible] рыд таксама накіраваны грэчаск[illegible] войскі. У даны момант для італ[illegible] яцаў узнікае небяспека, што гр[illegible] кі перарэжуць дарогу Корча-Д[illegible] грабец.

Англійская авіяцыя беспе[illegible] пынна бамбардыруе адступаючы[illegible] італьянскія калоны.

Уступленне грэчаскіх войск у Корчу

НЬЮ - ЙОРК, 22 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню афінскага карэспандэнта агенцтва Юнайтэд Прэс, грэчаскія войскі ўступілі ў Корчу. Італьянцы адступаюць у кірунку на поўнач ад возера Малік. Грэчаская кавалерыя і пяхота, выкарыстоўваючы захваченыя італьянскія танкі і матацыклы, атакуюць адступаючых італьянцаў у раёне Аргірокастрона. Механізаваны італьянскім часцям грэкі с[illegible] процьпаставілі матарызаваны[illegible] атрады, якія дзейнічаюць см[illegible] стойна ў горнай мясцовасці [illegible] вузкіх далінах, пазбягаючы с[illegible] тычак з італьянцамі ў адкрыт[illegible] полі. Грэкі пагражаюць Аргір[illegible] кастрону.

Новы старшыня Кангрэса вытворчых профсаюзаў у ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 22 лістапада. Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс з Атланты-сіці (штат Нью-Джэрсі), з'езд Кангрэса вытворчых профсаюзаў абраў старшынёй Кангрэса Мерэя замест[illegible] ушоўшага ў адстаўку Льюіс[illegible] Мерэй быў віцэ-старшынёй К[illegible] грэса вытворчых профсаюзаў.

Прыем Гесам Грандзі

БЕРЛІН, 22 лістапада (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што намеснік Гітлера Гес прыняў сёння ў Карычневым доме ў Мюнхене італьянскага міністра юстыцыі і ст[illegible] шыню фашысцкай карпарацыйн[illegible] палаты Грандзі, з якім ён м[illegible] працяглую гутарку.

З лэнты тэлеграфа

Па паведамленнях з Румыніі, Румынскія рабочыя жывуць у жудаснай беднасці. Абед складаецца толькі з бульбы і цыбулі. У некаторых рабочых няма хлеба. Іх кватэры — сырыя, халодныя і цёмныя.

* *

У Марселі зараз 20.000 беспрацоўных. Грузазбарот порта ўпаў з 150.000 тон у тыдзень да 10.000 тон.

* *

У Іспаніі сіляне абавязаны здаць да 30 лістапада дзяржаўным установам усе запасы пшаніцы, жыта і масла

* *

З пратэктарата Чахіі і Маравіі забаронены вывад хлеба і мучных вырабаў.

* *

Распараджэннем французскага ўрада 221 чыноўнік муніцыпалітэта горада Тулузы пераведзены прымусова на пенсію. 95—зволены

* *

Начальнік штаба амерыканскай арміі генерал Маршал заявіў, што амерыканскія ваенныя наглядальнікі лятаюць на англійскіх самалётах у часе паветраных баёў над Англіяй.

* *

Галандская дыпламатычная місія ў Вашынгтоне апублікавала заяву, у якой гаворыцца, што знаходзячыйся ў Лондане галандскі ўрад не задаволіць патрабаванні Германіі вызваліць немцаў, інтэрніраваных у Галандскай Індыі і ў Галандскай Вест-Індыі.

* *

У Куньмінне закончыліся кітайска-бірманскія перагаворы аб усталяванні рэгулярнай паштовай сувязі паміж абедзвюма краінамі. [illegible] лістапада ў Куньмін вышаў п[illegible] шы грузавік з поштай.

* *

Кітайскія патрыёты ў Шан[illegible] намецілі сабраць 300.000 кітайск[illegible] долараў на пакупку зімовай [illegible] праткі для кітайскіх байцоў. [illegible] тая сума ўжо сабрана і перавед[illegible] на ў Чунцін. Кампанія прад[illegible] жаецца. (ТАС[illegible])

Адказны рэдактар Г. Т. МІНЧУК[illegible]

Рашаючая насада загадчыкаў хат-чытален

[illegible] ле гурток па вы[illegible] кай Канстытуцы [illegible] 5 чалавек. Ужо [illegible] ятак.

Падрых[illegible] ІПХА. П[illegible] ных гурт[illegible] вучае „[illegible]роткі курс гісторыі ВКП(б)".

Нарада паказала, што ў большасці хат-чыталень раёна работа праводзіцца дрэнна. Культсоветы не працуюць. Ва многіх хатах-чытальнях работа праходзіць без плана і часта зводзіцца толькі да чытак газет. У Запрудскай хаце-чытальні да апошняга часу зусім не праводзілася работа.

Слабая работа культурна-асветных устаноў на вёсцы тлумачыцца нізкай палітычнай падрыхтоўкай іх загадчыкаў. Многія з іх не працуюць над сабой. Недастатковая аказваюць дапамогу загадчыкам хат-чытален раённыя арганізацыі і ў першую чаргу работнікі райана.

Н. Б

Первічная арганізацыя Асоавіяхіма не працуе

[illegible] таму назад у [illegible] Клашчэльскага ра[illegible] арганізацыя [illegible], у якую ўступіла [illegible] сабыцця проці[illegible] літаратуры па [illegible] ваенай справе члены Асоавіяхіма ўнесці 100 рублёў. [illegible] куплена [illegible] невядома куды падзеў[illegible]

Старшыня первічнай арганізацыі Оцефанюк.

За прайшоўшы час з членамі Асоавіяхіма не праводзілася і зараз не праводзіцца ніякай работы. Яны не вывучаюць ваеннай справы.

Не цікавяцца работай гэтай арганізацыі і Клашчэльскі раённы совет Асоавіяхіма А Бартнічук

ПАСТАНОВА
ВРЭСЦКАГА ГАРАДСКОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА

Ад 22 лістапада 1940 года.

У [illegible]ні пастаноў Брэсцкага [illegible]кома ад 19 кастрычніка [illegible] аб выбарчых округах, [illegible] кастрычніка 1940 года аб [illegible] выбарчых камісіях і ад [illegible]чніка аб выбарчых [illegible] на выбарах у мясцо[illegible] ты дэпутатаў працоў[illegible] канком пастанаўляе:

1. [illegible]ключыць з Фрунзенскага выбарчага ўчастка (з центрам [illegible] Фрунзенская 44 — інтэрнат) [illegible] округі №№ 153 і 154 (з центрам Брэст-Палескі — дом чыгуначніка) у звязку з тым, што тэрытарыяльна яны належаць раёвыканкому.

2. Ліквідаваць округовыя выбарчыя камісіі округоў №№ 153, 154 на падставе матываў, указаваных у пункце 1 гэтай пастановы.

Старшыня Брэсцкага горвыканкома РАШЧЫНСКІ.

Сакратар Брэсцкага горвыканкома ЗВАНСКІ.

Рост пагалоўя жывёлы ў Сібіры

[illegible] пасля апублікавання [illegible] Саюзнаркома СССР і [illegible] „Аб мерапрыемствах [illegible] грамадскай жывёлагадоўлі [illegible] калгасах" колькасць жывёлы на калгасных фермах Новасібірскай вобласці ўзрасла на 192.000 галоў. Сібірская жывёла [illegible]одае высокай тлушчамалочнасцю.

Абвяржэнне агенцтва Рэйтэр

ЛОНДАН, 22 лістапада. (ТАСС) Агенцтва Рэйтэр перадае, што, па вестках з аўтарытэтных крыніц, з'явіўшаяся за граніцай паведамленні аб тым, што французкі ваенны карабль увайшоў у Гібралтар і здаўся англійскім уладам, пазбаўлены ўсякай падставы. Як відаць, у гэтых паведамленнях скажаецца той факт, што гэта быў адзін французкі параход, на борту якога знаходзіліся рэпатрыіраваныя французы, якія накіроўваліся ў Марсель. Не выключана, што гэты параход увайшоў у Гібралтар.

Напярэдадні Усесаюзнага агляду самадзейных тэатральных калектываў

Драматычныя гурткі рэспубліка разагрнулі дзейную падрыхтоўку да Усесаюзнага агляду самадзейных тэатральных калектываў. У гарадах і раённых центрах створаны аргкамісіі па правядзенню агляду. Праведзена 80 семінараў з кіраўнікамі драмкалектываў. Ім былі прачытаны лекцыі аб асновах рэжысуры ў самадзейных гуртках, аб майстэрстве актораў, тэатральным грыме і інш.

Драматычны калектыў Горацкага сельскагаспадарчага інстытута пакажа на агляде п'есу „Партызаны" Крапівы. Удзельнікі гуртка мастацкай самадзейнасці Гомельскага лесакамбіната пакажуць п'есу „Рэвізор" Гогаля, драматычны калектыў Мінскага клуба металістаў —„Запарожац за Дунаем".

Першы тур агляду пачнецца 15 снежня. У ім прыме ўдзел каля 1 000 драмгурткоў рэспублікі, 600 драматычных калектываў мастацкай самадзейнасці ўжо зарэгістраваны для ўдзелу ў аглядзе. (БЕЛТА).

Хутка на экранах кіно-тэатраў Брэсцкай вобласці

I.

НОВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ПЯТЫ АКІЯН

ВЫТВОРЧАСЦЬ КІЕЎСКАЙ КІНОСТУДЫІ.

Рэжысёр: І Аненові.
Кампазітар: О. Патоцкі.

У галоўных ролях:
артысты-ордэнаносцы — А. Абрыкосаў, І. Новасельцаў, А Зуева.

II.

Новы гісторыка-біяграфічны фільм

ЯКАЎ СВЕРДЛОЎ

Пастаноўка заслужанага дзеяча мастацтва ордэнаносца С Ютковіча

У ролі В. І. Леніна заслужаны артыст РСФСР ордэнаносец М. Штраух.

У ролі І. В. Сталіна артыст А. Кобаладзе

У ролі Я. М. Свердлова заслужаны артыст РСФСР ордэнаносец Л. Любашаўскі.

Выпуск Брэсцкага абласнога аддзялення „ГАЛОЎКІНОПРАКАТ"

14 будаўнічы ўчастак
канторы Сельгасводазабеспячэння Белводбуда

прымае ад малгасаў, соўгасаў, арганізацый і ўстаноў

ЗАЯЎКІ і ЗАКЛЮЧАЕ ДАГАВОРЫ

на вытворчасць ніжэйперамеранаваных работ у 1941 г. па абласцях Беластоцкай, Брэсцкай і Баранавіцкай:

1. Буравае свердлы усіх дыяметраў, у мэтах водазнабжэння,
2. Абсталяванне водапад'ёмаў пры даламове навосаў штангавых, ка[illegible] цэнтрабежных і эрлефтаў.
3. Вытворчасць поштуваў і работ па прыкладзе водаправо[illegible] [illegible] і па аўтаматыцы.

Адрыс: [illegible] Участка Белсток, вул. К[illegible] тел. 10-05.

СЁННЯ Ў КІНОТЭАТРАХ

Кінатэатр „1-га МАЯ"
МУЗЫКАЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

Кінатэатр імені Горкага
АГНІ ВЯЛІКАГА ГОРАДА

БРЭСЦКАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ АШЧАДНАЯ КАС[illegible]

даводзіць да ведама грамадзян г. Брэста,

ШТО АШЧАДКАСА № 5417/0[illegible]

якая знаходзілася ў кр[illegible] часова зміяшчаецца ў памяшкан[illegible] Цэнтральнай ашчадкасы (Маскоўская вуліца № 20).

МЯНЯЮ КВАТЭРУ

з двума вялікімі пакоямі (60 кв. метраў) з будобаставі на кватэру з двума маленькімі пакоямі.

Звяртацца па адрасу: Куйбышава 61 кв.4, або званіць па тэлефону 7-56.

БРЭСЦКАМУ РУСКАМУ ДРАМАТЫЧНАМУ ТЭАТР[illegible]

ПАТРАБУЮЦЦА:

касір-рахункавод, сакратар-машыністка, машыніст сцэны, рабочыя сцэны, мебе[illegible] шчык, рэквізітар, бутафор, старшы [illegible] вец, адзяжальшчыцы, загадчык грымёрных цэхам, майстар-цырульнік, столяры [illegible] успамагальны састаў.

[illegible]тановамі [illegible] [illegible]цыя.

Адрас рэдакцыі г. Брэст, вуліца імені Карла Маркса 29. Тэлефоны: адказнага рэдактара—1-17, нам. адказнага рэдактара — 7-58, аддзелы: земляробчы, партыйны і прапаганды — 1-23 і мясцовая рэдакцыя — 7-19